реть и прорецензировать сотни видеороликов, анимированных рисунков, сайтов и других материалов, связанных с учебной программой по астрономии,

В подобном ключе для школьников и учителей подготовлено методическое пособие «Интернет-гид по страницам учебника астрономии». В этой книге конкретно по каждому рисунку благодаря QR-кодам указывается на ту интересную и полезную информацию, спрятанную за внешним фасадом рисунка.

**Заключение**. Использование смартфонов и планшетов благодаря QR-технологии становится всё более популярной в учебном процессе. Как показала практика и проведенное анкетирование, студенты и школьники охотно применяют технические новинки, как в повседневной жизни, так и в образовательном процессе.

Применение мобильных электронных средств в образовании нужно рассматривать как педагогический прием, расширяющий возможности обучения. Это средство передачи знаний, привязанное к определенной предметной области.

1. Галузо, И.В. Электронное обучение студентов и школьников: монография / И.В. Галузо. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2019. – 306 с.

2. Галузо, И.В. Нужны ли мобильные устройства в учебном процессе? / И.В. Галузо // Современное образование Витебщины. – 2020. – № 1. – С. 26–35.

3. Галузо, И.В. Дополненная реальность – главная особенность современных учебных пособий / И.В. Галузо, Р.В. Опарин – Научно-практическая конференция «Цифровая трансформация образования». 30 мая 2018 г. Электронный сборник тезисов. — Минск: ГИАЦ Минобразования, 2018. — С. 291–294. [Режим доступа: http://dtconf.unibel.by/doc/DTE_conference.pdf. Дата доступа 20.06.18 г.]

## АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА ПАВЫШАНЫМ УЗРОЎНІ

*І.А. Ганчарова*
*Магілёў, ДУА "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва"*

У адпаведнасці з Праграмай дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь на 2015 год, зацверджанай Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 лютага 2015 г. № 110, забеспячэнне даступнасці і якасці паслуг адукацыі з'яўляецца мэтай, накіраванай на захаванне і ўмацаванне чалавечага патэнцыялу для ўстойлівага развіцця дзяржавы. Адзін з механізмаў дасягнення дадзенай мэты — увядзенне ў X — XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі профільнага навучання, якое спалучае вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні і наведванне прафесійна арыентаваных факультатыўных заняткаў. Профільнае навучанне – гэта сродак дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, які дазваляе за кошт змен у структуры, змесце і арганізацыі адукацыйнага працэсу больш поўна ўлічваць інтарэсы, схільнасці і здольнасці навучэнцаў, ствараць умовы для навучання старшакласнікаў, згодна з прафесійнымі інтарэсамі і выбарам далейшай адукацыі.

Мэта артыкула – разгледзець тэарэтычныя асновы арганізацыі профільнага навучання, яго практычную рэалізацыю як сродак рэалізацыі асобасна-арыентаванага вучэбнага працэсу, пры якім значна пашыраюцца магчымасці стварэння вучнем індывідуальнай адукацыйнай траекторыі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла вучэбна-праграмная дакументацыя, якая рэгламентуе профільнае навучанне. Асноўныя метады даследавання – педагагічны эксперымент, аналіз навуковай літаратуры і праграмнай дакументацыі,

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Асноўнымі мэтамі ўвядзення профільнага навучання з'яўляюцца:

- забеспячэнне належнага ўзроўню агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі выпускнікоў, больш поўнага задавальнення іх адукацыйных запытаў, гатоўнасць да працягу адукацыі па абраным профілі і паспяховай працоўнай дзейнасці;
- прадстаўленне навучэнцам роўных магчымасцей для вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў на павышаным і паглыбленым узроўнях;
- стварэнне ўмоў для працоўнага (прафесійнага) навучання і атрымання навучэнцамі адпаведнай кваліфікацыі рабочага (служачага);



Репозиторий ВГУ

• забеспячэнне пераемнасці ў змесце, метадах і формах навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Асноўныя задачы профільнага навучання:

• Забяспечыць паглыбленае вывучэнне асобных прадметаў праграмы;

• Стварыць умовы для ажыццяўлення дыферэнцыяцыі зместу навучання старшакласнікаў з шырокімі і гнуткімі магчымасцямі пабудовы школьнікамі індывідуальных адукацыйных праграм;

• Спрыяць усталяванню роўнага доступу да паўнавартаснай адукацыі розным катэгорыям, якія навучаюцца ў адпаведнасці з іх здольнасцямі, індывідуальнымі схільнасцямі і патрэбамі;

• Пашырыць магчымасці сацыялізацыі навучэнцаў, забяспечыць пераемнасць паміж агульнай і прафесійнай адукацыяй, больш эфектыўна падрыхтаваць выпускнікоў школы да засваення праграм вышэйшай прафесійнай адукацыі.

У цяперашні час значна ўзрастаюць патрабаванні да якасці падрыхтоўкі выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў, што выяўляецца перш за ўсе ў іх здольнасці самастойна і свядома ажыццяўляць выбар будучай прафесійнай дзейнасці, актыўна ўключацца ў вырашэнне задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым актуалізуецца праблема ўдасканалення адукацыйнага працэсу на старэйшай ступені агульнаадукацыйнай школы. Яе эфектыўнае рашэнне перш за ўсе звязана з пабудовай зместу адукацыі на аснове шырокай профільнай дыферэнцыяцыі, якая дазваляе больш поўна ўлічваць як інтарэсы і здольнасці навучэнцаў, так і запатрабаванні грамадства і дзяржавы ў фарміраванні сацыяльна актыўнай і творчай асобы грамадзяніна.

Фарміраванне X профільных класаў можа праходзіць па некалькіх мадэлях:

• мадэль 1: аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні аднолькавыя навучальныя прадметы;

• мадэль 2: аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць на павышаным узроўні розныя навучальныя прадметы;

• мадэль 3: аб'яднанне ў адным класе навучэнцаў, якія вывучаюць асобныя навучальныя прадметы на павышаным узроўні, і навучэнцаў, якія вывучаюць усе навучальныя прадметы на базавым узроўні.

Адна з асаблівасцей профільнага навучання — гэта яго прафесійная арыентаванасць. Пры ўвядзенні профільнага навучання мяркуюцца два узроўні вывучэння вучэбных прадметаў — базавы і павышаны. Выкладанне вучэбных прадметаў на базавым узроўні арыентавана на забеспячэнне пераважна агульнаадукацыйнай і агульна-культурнай падрыхтоўкі навучэнцаў.

Вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні скіравана на будучую прафесійную адукацыю навучэнцаў, развіццё іх індывідуальных здольнасцей шляхам больш глыбокага, чым прадугледжваецца базавым курсам, засваення асноў навук, сістэматычных ведаў па вучэбным прадмеце. Павышаны ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета – узровень засваення вучнямі зместу адукацыі па вучэбным прадмеце, арыентаваны на набыцце навучэнцамі сістэматычных ведаў і спосабаў дзеянняў, які забяспечвае развіцце сродкамі вучэбнага прадмета прадметных і асобасных здольнасцей (кампетэнцый), неабходных для працягу абранага напрамку адукацыі, асобаснага самаразвіцця і прафесійнага самавызначэння, а таксама для ўсвядомленага і эфектыўнага вырашэння адукацыйных і жыццёвых задач.

Для рэалізацыі павышанага ўзроўню вывучэння беларускай мовы ў X класе распрацавана вучэбная праграма (105 гадзін у год), змест якой складаюць наступныя раздзелы: «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства», «Маўленне», «Тэкст», «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення», «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага».

Такім чынам, прыярытэтнай задачай профільнага навучання становіцца фарміраванне культуры вуснага і пісьмовага маўлення навучэнцаў, таму засваенне і асэнсаванне ўсіх моўных адзінак на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца ў аспекце культуры маўлення, што і перадаюць назвы раздзелаў вучэбнай праграмы. У сувязі з гэтым пашыраюцца веды

Рэпазіторый ВДУ

вучняў пра нормы беларускай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя), сродкі і прыёмы маўленчай выразнасці, стылістычную ролю і тэкстаўтваральныя магчымасці моўных сродкаў беларускай мовы, удасканальваюцца ўменні даваць ацэнку чужым выказванням і рэдагаваць уласныя.

Разам з тым рэалізацыя новага інтэграванага зместу на аснове міжпрадметных сувязей прадугледжвае пашырэнне паняційнага апарату, звязанага з інтэграцыяй міжпрадметных навучальных курсаў (мова, культура маўлення, стылістыка, рыторыка), засваенне вучнямі паняццяў «стылістычная норма», «стылістычная памылка» і інш. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні развіццё моўнай кампетэнцыі навучэнцаў адбываецца ў напрамку пашырэння іх слоўнікавага запасу, у тым ліку за кошт лінгвістычнай і міжпрадметнай тэрміналогіі (лексіка такіх дысцыплін, як мова, маўленне, культура маўлення, стылістыка, рыторыка), знаёмства з творамі (фрагментамі твораў) беларускай літаратуры, засваення актуальнай грамадска-палітычнай, эканамічнай, інфармацыйнай лексікі, а таксама развіцця граматычнага ладу маўлення. Вучэбны матэрыял, звязаны з фарміраваннем лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі, пададзены ва ўводным раздзеле «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства» (мова і нацыянальная культура, мова і гісторыя народа і г.д.), раздзеле «Лексіка. Фразеалогія» (безэквівалентная лексіка, фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі і інш.), а таксама праз культуразнаўчыя тэксты, якія адлюстроўваюць разнастайныя праявы культуры беларускага народа (звычаі, побыт, каштоўнасці і інш.).

Мультыпрофільнае навучанне – адзін з варыянтаў арганізацыі профільнага навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, які прадугледжвае рэалізацыю індывідуальных адукацыйных траекторый навучэнцаў і стварэнне профільных груп для вывучэння прадметаў на павышаным узроўні з улікам прафесійных намераў, схільнасцей, запатрабаванняў і інтарэсаў вучняў. Пры гэтым кожны вучань мае індывідуальны расклад заняткаў. Індывідуалізацыя, што мае на ўвазе мультыпрофільнае навучанне, з’яўляецца найважнейшым фактарам павышэння матывацыі школьнікаў і адказнасці за сваё навучанне. Хацелася б звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць: пры мультыпрофільнай мадэлі разам у групе вучацца падлеткі з аднолькавым ці блізкім узроўнямі навучанасці, падобнымі ці блізкімі адукацыйнымі прыярытэтамі… А калі вучні маюць аднолькавую матывацыю і ўзровень падрыхтоўкі, то і вынікі іх работы, як паказвае практыка, атрымліваюцца больш высокімі.

Менавіта мультыпрофільныя класы створаны ў нашай школе ў гэтым навучальным годзе. 6 вучняў абралі вывучэнне беларускай мовы на павышаным ўзроўні.

Адразу хочацца сказаць, што плюсы работы ў профільных класах відавочныя. Па-першае, гэта павелічэнне колькасці гадзін з 1 да 3 (можна і больш). Другое, невялікая колькасць вучняў, што дае магчымасць ажыццяіць аобасна-арыентаваны падыход да кожнага. Па – трэцяе, свядомае самавызначэнне і выбар прадмета, які будзе вывучацца на павышаным ўзроўні, што грае немалаважную ролю, бо значна прасцей працаваць з мэтанакіраванымі, матываванымі навучэнцамі.

Асноўным крытэрыем выбару метадаў і сродкаў навучання ў такім класе з'яўляецца ўзровень падрыхтаванасці навучэнцаў, сфарміраванасці ў іх прыемаў вучэбнай дзейнасці, агульнавучэбных уменняў і навыкаў. У мяне ў класе вучні прыблізна аднаго ўзроўню падрыхтаванасці, што значна аблягчае работу. Усе яны будуць здаваць ЦТ па беларускай мове, таму ўся мая дзейнасць накіравана на гэта. Я пабудавала сваю работу наступным чынам: вывучаемы матэрыял разбіла на пэўныя блокі, модулі згодна з праграмай, і пасля пэўнага раздзелу мы выконваем тэматычныя тэсты, заданні, практыкаванні , накіраваныя на адпрацоўку практычных навыкаў і ўменняў, у дадатак да тых практыкаванняў і заданняў, якія змешчаны ў падручніку. Напрыклад, прайшлі правапіс вялікай літары і правапіс слоў асобна, разам, праз дэфіс, выконваем тэсты гэтай тэматыкі, прайшлі тэму фанетыка і арфаэпія, выконваем заданні гэтага тэматычнага блоку і г.д. Улічваючы, што вучню профільнага класа неабходна засвойваць вялікі аб'ем інфармацыі, то яе мэтазгодна прадстаўляць у сціслай форме ў выглядзе памятак, апорных схем, інструкцый, алгарытмаў, блок-схем, табліц. Безумоўна, гэта патрабуе ад настаўніка часу на падрыхтоўку, але дае магчымасць

Рэпазіторый ВДУ

больш грунтоўнай падрыхтоўкі для вучняў, тым больш, што яны, як ніхто іншы, у гэтым зацікаўлены.

**Заключэнне.** Як паказала практыка, асноўнай формай арганізацыі ўрока ў профільным класе з'яўляецца урок-практыкум. Пры адсутнасці тэарэтычнага матэрыялу ў падручніку - урок-лекцыя. Напэўна, не кожны настаўнік ведае, што этымалогія слова «ўрок» вядзе свой пачатак ад старажытнарускага «урекать» - псаваць, шкодзіць, ганьбіць. І мне б хацелася, каб кожны настаўнік, у якім бы класе ён не працаваў, імкнуўся навучыць, дапамагчы, параіць, накіраваць, але ніякім чынам не нашкодзіць.

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. 13 студзеня 2011 г. № 243-З // Нац. рыестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь. – 2011. – № 13 – 2/1795.
2. Гурчонак, А. В. Арганізацыя тлумачэння арфаграфічных правіл з дапамогай апорных канспектаў / А. В. Гурчонак // Беларуская мова і літаратура. – 2010. – № 6 – 7, 10; – 2011. – № 4, 5.
3. Глинский, А.А. Управление системой методической работы в общеобразовательном учреждении / А.А. Глинский. – Минск : Зорны верасень. – 2008.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ТЕХНОЛОГИИ РАЗВИТИЯ КРИТИЧЕСКОГО МЫШЛЕНИЯ НА УРОКАХ РУССКОГО ЯЗЫКА И ЛИТЕРАТУРЫ КАК КЛЮЧЕВОЙ ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ ЛИНГВОКУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКОЙ КОМПЕТЕНЦИИ: ОТ ТЕОРИИ К ПРАКТИКЕ

*Э.В. Григорук*
*Могилев, ГУО «Средняя школа № 32 г. Могилева»*

Современное общество выдвигает новые требования к школе, к образовательному процессу. Новые социальные запросы определяют цели образования как общекультурное, личностное и познавательное развитие учащихся, обеспечивающее такую ключевую компетенцию образования, как «научить учиться». У каждого педагога имеется возможность самостоятельно выбирать методы и способы обучения, наиболее оптимальные для организации учебного процесса. В практике своей работы я использую методы и приёмы технологии развития критического мышления. Её применение способствует созданию условий для творческой самореализации обучающихся. Сущность технологии – практическая реализация личностно-ориентированного подхода в обучении. Особенностью данной педагогической технологии является то, что учащийся в процессе обучения сам контролирует этот процесс, ставя перед собой реальные и конкретные цели, самостоятельно отслеживает направления своего развития и определяет конечный результат.

Отличительные черты технологии критического мышления: самостоятельность, обобщённость, аргументированность, постановка и решение проблемы. Технология формирования критического мышления предполагает: акцент на поиск и самостоятельное получение знаний; активное использование личного опыта и накопленных умений обучающихся; наличие у обучающихся аргументированной личностной позиции; создание ситуации успеха; взаимодействие «педагог – обучающийся»; стимулирование возможности применения новых знаний и умений на практике.

Основная цель технологии – активное вовлечение учащихся в учебно- познавательную деятельность. В основу ее применения положены следующие принципы: активизация образовательного процесса; использование групповых форм обучения и навыков самостоятельной работы; мотивация обучающихся на самообразование путем освоения приёмов технологии развития критического мышления; соотнесение содержания учебного процесса с конкретными жизненными задачами; использование графических приёмов при усвоении учебного материала.

Цель исследования: разработка модели организации учебного процесса н уроках русского языка и литературы через использование элементов технологии критического мышления для формирования лингвокультурологической компетенции.

**Материал и методы.** Методы исследования: теоретический анализ психолого-педагогической и методической литературы по проблеме исследования; систематизация; наблюдение; опросные методы, педагогический эксперимент. Экспериментальная часть выполнена на базе государственного учреждения образования Средняя школа № 32 г. Могилева» при участии автора исследования.



Репозиторий ВГУ